Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

DOI:10.17951/sb.2024.18.253-268
Studia Białorutenistyczne 18/2024 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Alena Basalai

European Humanities University, Vilnius (Lithuania)
e-mail: e.basalai@gmail.com
https://orcid.org/0000-0001-7097-1767

Прававая тэрміналогія ў беларускім заканадаўстве з рэтраспектыўнага і праспектыўнага погляду

Legal Terminology in Belarusian Legislation from a Retrospective and Prospectus Viewpoint

Terminologia prawna w ustawodawstwie białoruskim z perspektywy retrospektywnej i prospektywnej

Abstract

The article is devoted to the analysis of the problem of formation of legal terminology in the Belarusian language. It is noted that since the beginning of the 20th century, legislative acts in Belarus were initially developed in Russian, but at the same time were translated into Belarusian. The main periods of rule-making before the period of independence, when the status of the Belarusian language was the only state language, are analysed, and the distinctive features of the transition period are highlighted. The problem of translating terms into the Belarusian language is analysed on the basis of an analysis of international agreements and acts of domestic Belarusian legislation. It is noted that the dominance of the practice of translating legislative acts into the Belarusian language, the lack of a permanent tradition of rule-making in Belarusian, the limited use of the Belarusian language in law enforcement negatively affects the development of special legal terminology in Belarusian. As a result, borrowings, mainly Russianisms, get along in translations. As a possible solution to the problem, it is proposed to analyse the origin of the term during translation, and combine the translation process with scientific research activities. In the context of the existence of two official languages, it is important to simultaneously create authentic texts in both languages. The best solution to the problem is the existence of the Belarusian language as a single state and a single language of legislation.

Keywords: legal lexicon, legal terminology, language of legal acts, Belarusian legislation

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Abstrakt

Artykuł poświęcony jest analizie zagadnienia kształtowania się terminologii prawniczej w języku białoruskim. Należy zauważyć, że od początku XX w. akty ustawodawstwa w Białorusi były najpierw opracowywane w języku rosyjskim, ale jednocześnie robiono tłumaczenia na język białoruski. Przeanalizowano główne okresy tworzenia norm, zaczynając od momentu ukształtowania Białoruskiej SRR do odzyskania niepodległości w 1991 r., tj. do momentu, kiedy język białoruski miał status jedynego języka państwowego, wyodrębniono charakterystyczne cechy każdego okresu. Przeanalizowano problem tłumaczenia terminów prawniczych na język białoruski na podstawie analizy umów międzynarodowych oraz aktów wewnętrznego ustawodawstwa białoruskiego. Podczas badania zauważono, że dominacja praktyki tłumaczenia aktów prawnych na język białoruski, brak stałej tradycji tworzenia norm w języku białoruskim, ograniczenia w użyciu języka białoruskiego w egzekwowaniu prawa negatywnie wpływa na opracowanie specjalnej terminologii prawniczej w języku białoruskim. W rezultacie w tłumaczeniach na język białoruski przeważają zapożyczenia, głównie rusycyzmy. Jako możliwy sposób rozwiązania problemu proponuje się analizowanie podczas tłumaczenia pochodzenia terminu, a proces tłumaczenia łączyć z działalnością badawczą. W warunkach istnienia dwóch języków państwowych ważne jest równoległe tworzenie autentycznych tekstów w obu językach. Najlepszym rozwiązaniem problemu byłoby jednak sprowadzenie języka białoruskiego do statusu jedynego języka urzędowego i jedynego języka ustawodawstwa białoruskiego.

Słowa kluczowe: leksykon prawniczy, terminologia prawnicza, język aktów prawnych, ustawodawstwo białoruskie

Анатацыя

Артыкул прысвечаны аналізу праблемы фарміравання прававой тэрміналогіі ў беларускай мове. Адзначаецца, што ад пачатку XX ст. акты заканадаўства ў Беларусі распрацоўваліся на рускай мове, але адначасова рабіліся пераклады на беларускую мову. У тэксце прааналізаваны асноўныя перыяды норматорчасці ад часу ўтварэння Беларускай ССР да перыяду атрымання незалежнасці ў 1991 г., г.зн. да моманту, калі беларуская мова ў краіне была адзінай дзяржаўнай, вылучаны адметныя рысы кожнага перыяду. Прааналізавана праблема перакладу юрыдычных тэрмінаў на беларускую мову на падставе аналізу міжнародных пагадненняў і актаў унутранага беларускага заканадаўства. У даследаванні адзначана, што панаванне практыкі перакладу актаў заканадаўства на беларускую мову, адсутнасць сталай традыцыі норматорчасці па-беларуску, абмежаванасць ужывання беларускай мовы ў правапрымяненні негатыўна ўплывае на выпрацоўку спецыяльнай юрыдычнай тэрміналоіі па-беларуску. У выніку ў перакладах ужываюцца запазычанні, пераважна русізмы. У якасці магчымага варыянта вырашэння праблемы ў артыкуле прапануецца аналізаваць падчас перакладу паходжанне тэрміна, а сам працэс спалучаць з навукова-даследчыцкай дзейнасцю. Ва ўмовах існавання дзвюх дзяржаўных моў важна адначасовае стварэнне аўтэнтычных тэкстаў на абедзвюх мовах. Найлепшым жа вырашэннем праблемы бачыцца існаванне беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай і адзінай мовы заканадаўства.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Ключавыя словы: прававая лексіка, юрыдычная тэрміналогія, мова прававых актаў, беларускае заканадаўства

Уводзіны

Пытанне ўжывання беларускай мовы ў заканадаўстве, афіцыйным справаводстве Беларусі перманентна адносіцца да складаных і праблемных. Існаванне дзвюх дзяржаўных моў згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на практыцы выглядае не толькі як няроўнасць, але і амаль як адсутнасць прысутнасці беларускай мовы ў правой сферы. З аднаго боку, пасля палітычных падзей 2020 г. сітуацыя вакол беларускай мовы пагоршылася. Зафіксаваныя выпадкі, калі факт ужывання беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці афіцыяльнымі структурамі дзяржавы быў кваліфікаваны як парушэнне заканадаўства з наступным прыцягненнем да адказнасці (Obzor narušenij). З другога боку, тыя самыя падзеі сталі каталізатарам пашырэння выкарыстання беларускай мовы ў асяродку беларусаў, найперш тых, хто вымушана пакінуў Беларусь. На фоне атаясамлення з Расіяй пасля падзеяў лютага 2022 г. у шэрагу асоб адбыўся пераход на беларускую мову ў паўсядзённым жыцці, а таксама ў працоўнай дзейнасці. Запыт на беларускую мову з боку грамадства пашырыўся ў розных сферах. У кантэксце будучых рэформ у прававой сістэме Беларусі зноў стала актуальным пытанне нарматворчасці па-беларуску. Ёсць запыт з боку грамадства на беларускамоўную адукацыю, у тым ліку юрыдычную. Нефармальная адукацыя мела і раней свае формы выражэння, існавала пэўная колькасць грамадскіх праектаў у межах Беларусі. Сітуацыя з фармальнай адукацыяй па-беларуску ўнутры краіны заўсёды была праблемным полем. Акрамя падрыхтоўкі спецыялістаў па ўласна беларускай філалогіі, існавала толькі адна нефілалагічная спецыяльнасць, дзе навучанне адбывалася па-беларуску. Гэта спецыяльнасць „Гісторыя" ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Фатальнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ва ўсёй краіне, пры юрыдычнай роўнасці абедзвюх дзяржаўных моў, вышэйшую адукацыю можна атрымаць толькі па-руску. На пачатку 90-х гадоў на юрыдычных спецыяльнасцях некаторыя дысцыпліны выкладаліся на беларускай мове, выходзілі падручнікі, у тым ліку па юрыдычнай прафесійнай лексіцы (Smol′skaâ, Hryščanovič, 2011), але такі стан справаў не быў працяглым. У такіх абставінах развівацца прафесійнай юрыдычнай тэрміналогіі натуральным шляхам было вельмі складана. Для будучых рэформ дэмакратычнай Беларусі, нарматворчасці і для выкладання прававых дысцыплін па-беларуску надзвычай важна мець выпрацаваны адзіны тэрміналагічна-паняційны апарат.

На падставе аналізу манаграфій, навуковых артыкулаў юрыстаў і лінгвістаў, у публікацыі праводзіцца даследаванне фактычнага стану юрыдычнай прафесійнай тэрміналогіі. Разгледжаны асноўныя этапы нарматворчасці ад пачатку XX ст.,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

па-беларуску. Праналізаваны выбраныя акты унутранага заканадаўства, міжнародныя дамовы, удельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. На прыкладзе пэўных юрыдычных тэмінаў праілюстравана недасканаласць перакладаў і ў шэрагу выпадкаў адсутнасць беларускамоўных адпаведнікаў. Артыкул прадстаўляе сабою ўводзіны да паглыбленага даследавання праблемы фарміравання беларускай юрыдычнай тэрміналогіі.

Асноўная частка

Юрыдычную мову часам называюць „птушкавай", што азначае 'цяжка зразумелай для непрафесіяналаў'. Мова, якой карыстаюцца юрысты, насычаная спецыфічнай тэрміналогіяй, дзе кожнае паняцце мусіць мець сваё пэўнае і дакладнае значэнне. У прававой сферы асабліва важна выкарыстоўваць аднолькавую аднастайную тэрміналогію. Дастаткова працяглы час працэс нормастворчасці, правапрымянення, юрыдычнай навукі і адукацыі існаваў у пераважнай большасці на рускай мове. Пераход да стварэння актаў заканадаўства па-беларуску актуалізуе праблему перакладаў актаў заканадаўства і выпрацоўкі неабходнай прававой тэрміналогіі.

Праблема фактычнага нераўнапраўя моваў у галіне заканадаўчай дзейнасці вядомая і неаднаразова з'яўлялася прадметам увагі навукоўцаў, найперш лінгвістаў, якія адзначалі адсутнасць роўнасці беларускай і рускай моў у розных сферах чалавечага жыцця, у тым ліку і ў сферы заканадаўства. І менавіта тут, у прававой сферы, сітуацыя выглядае найменш аптымістычна. Варта адзначыць, што навукоўцы-юрысты таксама не абмінаюць гэтай праблемы. У працах беларускіх прававедаў абмяркоўвалася пытанне забеспячэння роўнасці моў у прававой сферы, вырашэння праблемы мовы судаводства (Martinovič, 2008, s. 12–16), неабходнасці лінгвістычнага забеспячэння мовы судаводста, у тым ліку наяўнасці актаў заканадаўства на беларускай мове (Martinovič, 2012, s. 72–75). Аўтары звярталі ўвагу, што магчымасць сапраўднага выканання патрабаванняў артыкула 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы) існуе толькі пры ўмове публікацыі актаў заканадаўства адразу на абедзвюх дзяржаўных мовах (Vasilevič, 2003, s. 195).

Асноўныя этапы развіцця беларускага заканадаўства

Заканадаўства ў форме кодэксаў, дэкрэтаў, указаў, законаў і г.д. пачало фарміравацца на пачатку XX ст. Згодна з артыкулам 34 Канстытуцыі СССР 1924 г. *Декреты и постановления Центрального Исполнительного Комитета, его*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Президиума и Совета Народных Комиссаров Союза Советских Социалистических Республик печатаются на языках, общеупотребительных в союзных республиках (русский, украинский, белорусский, грузинский, армянский, тюрко-татарский). У літаратуры выказваецца думка, што гэта былі пераклады (Kuleš, 2016, s. 153–158).

Практыка перакладаў агульнасаюзных законаў СССР захавалася адносна актаў, што дзейнічалі ў БССР. У 1920-х гг. былі прынятыя і перакладзеныя на беларускую мову Канстытуцыя (1927), Кодэкс аб шлюбе і сям'і (1927), Папраўча-працоўны (1927), Водна-меліярацыйны (1927), Крымінальны (1928), Зямельны (1929) кодэксы.

Падчас унясення зменаў у першыя кодэксы БССР (Крымінальны кодэкс (1935; 1938), Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы (1935), Кодэкс законаў аб працы (1936)) сістэма перакладу на беларускую мову захавалася. Публікацыя прынятых актаў заканадаўства на беларускай і рускай мовах ажыццяўлялася ў афіцыйным перыядычным выданні *Збор законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў Савета Міністраў Беларускай ССР*. Ганна Кулеш, пры даследаванні пытанняў тэрміналогіі прававых актаў, а таксама юрыдычнай літаратуры таго часу адзначае, што ў дакументах існавала „нявытрыманасць тэрміналёгіі" а „яшчэ горшая справа са стылем тэксту беларускіх законаў" (Kuleš, 2015, s. 5).

Пачатак 1930-х гг. характарызуецца як час сур'ёзных зменаў, са значным пашырэннем рускамоўнага ўплыву (Sâmeška , 1998, s. 46). Пасля рэформы правапісу 1933 г. адбыліся сутнасныя змены ў беларускай мове ўвогуле, гэты паварот стаў вельмі заўважным і ў мове прававых актаў. Ганна Кулеш адзначае, што змены адбыліся на лексічным і граматычным узроўнях, што яскрава праілюстравана пры дапамозе параўнання Кодэксаў аб шлюбе і сям'і 1927 г (далей – КЗаШС-27) і 1935 г. (далей – КЗабШС-35):

брачный возраст – шлюбны век (КЗаШС-27, 12) – *шлюбны ўзрост* (КЗаШС-35, 12);
дело возбуждено – справа паднята (КЗаШС-27, 14) – *справа ўзбуджана* (КЗаШС-35, 14);
на началах общей собственности - на асновах супольнае ўласнасьці (КЗаШС-27, 21) - *на началах агульнай уласнасці*;
забеременевшая женщина – цяжарная кабета (КЗаШС-27.42) – *цяжарная жанчына* (КЗаШС-35, 11);
слабоумные подлежат опеке – над слабымі на розум устанаўляецца апека (КЗаШС-27, 99) – *над слабавумнымі ўстанаўляецца апека* (КЗаШС-35, 99);
над расточителями устанавливается попечительство – над марнатраўцамі ўстанаўляецца папячыцельства (КЗаШС-27, 100) – *над растачыцелямі ўстанаўліваецца папячыцельства* (КЗаШС-35, 100) і інш.;
брак признан недействительным – шлюб прызнаны за неправадзейны (КЗаШС-27) – *шлюб прызнан неправадзейным* (КЗаШС-35 11) (Kuleš, 2016, s. 156–157).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі, у пасляваенны перыяд беларуская мова была выцеснена з прававой сферы (Krasnej, 1998, s. 205). Фактычны стан праблемы ў згаданы час заслугоўвае асобнай увагі і чакае свайго даследчыка.

Наступны этап актыўнай нарматворчасці адбыўся ў 1960–80-я гг. У гэты час былі прыняты кодэксы, у тым ліку па-беларуску: Крымінальны (1961), Крымінальна-працэсуальны (1961), Грамадзянскі (1965), Грамадзянскі працэсуальны (1965) кодэксы, Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы (1969). Пазней зявіліся Зямельны (1971), Папраўча-працоўны (1971), Кодэкс законаў аб працы (1972), Водны (1973), Кодэкс аб нетрах (1979), Лясны кодэкс (1980), Жыллёвы кодэкс (1984). Можна адзначыць павелічэнне колькасці актаў заканадаўства ўвогуле. З улікам таго, што беларускамоўныя тэксты прынятых актаў былі падрыхтаваныя і друкаваліся ў афіцыйных выданнях, гэты працэс немагчыма прадставіць без сур'ёзнай працы над тэрміналагічным апаратам. Некаторыя кодэксы (напрыклад, Грамадзянска-працэсуальны) былі прыняты ўпершыню. Зусім іншае пытанне, наколькі гэтыя беларускамоўныя акты заканадаўства выкарыстоўваліся ў правапрымяняльнай практыцы. Варта прывесці змест артыкула 86 Канстытуцыі БССР 1937 г., згодна з якім

> Судопроизводство в БССР ведется на белорусском языке с обеспечением для лиц, не владеющих этим языком, полного ознакомления с материалами дела через переводчика, а также права выступать на суде на родном языке (Konstituciâ BSSR 1937 g., art. 86).

Выключна з літаральнага аналізу зместу нормы выцякае абавязак для суддзяў, бакоў працэсу выкарыстоўваць у судовым паседжанні беларускую мову, адпаведна на ёй жа складаць працэсуальныя дакументы, у тым ліку рашэнні суда. Няма спецыяльнай нормы аб абавязку пры гэтым спасылацца і абгрунтоўваць сваю пазіцыю ў судовым працэсе на падставе беларускамоўных тэкстаў актаў заканадаўства, але гэта лагічна ўпісваецца ў агульны падыход.

Працэс стварэння сістэмы ўласнага заканадаўства пасля 1990-х гг. у Беларусі заняў досыць доўгі перыяд, і першыя кадыфікаваныя акты Рэспублікі Беларусь з'явіліся праз 6–7 год пасля атрымання незалежнасці. Да гэтага часу дзейнічалі галіновыя кодэксы БССР. Кадыфікаваныя акты распрацоўваліся на падставе Мадэльных кодэксаў СНД, якія былі падрыхтаваны ў Маскве па ініцыятыве Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД (была створана 27 сакавіка 1992 г.). Да распрацоўкі мадэльных кодэксаў запрашаліся аўстрыйскія спецыялісты, улічваўся досвед еўрапейскіх краін. Але далёка адыйсці ад той тэрміналогіі, якая была напрацавана савецкімі кодэксамі, не ўдалося.

Перыяд існавання беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, у тым ліку і адзінай мовы прававых актаў, быў вельмі кароткім, каб на поўную моц запусціць працэс нарматворчасці. Асноўны масіў прыняцця нацыянальных кодэксаў, законаў прыйшоўся на перыяд пасля 1998 г. Тым не менш унёсак у справу не варта памяншаць. Пэўныя акты, у тым ліку міжнародныя пагадненні, прынятыя

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

ў перыяд з 1990 г. да 1996 г., працуюць да цяперашняга часу і абслугоўваюць міжнародны абарот па найважнейшых пытаннях.

На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае 26 кодэксаў (толькі 1 па-беларуску, Кодэкс аб культуры). Праца па неафіцыйным перакладзе кодэксаў на беларускую мову пачалася адносна нядаўна. Перакладам займаюцца дзве ўстановы: Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Нягледзячы на ўсе адмоўныя абставіны, працэс нормatворчасці па-беларуску ў Беларусі ажыццяўляецца штодзённа. Просты запыт да афіцыйнай базы прававой інфармацыі (www.pravo.by) паказвае наяўнасць прынятых дакументаў амаль кожны дзень, у асноўным гэта:

- рашэнні аб узнагародах;
- камандзіроўкі;
- унясенне зменаў ва ўжо прынятыя акты на беларускай мове.

Асноўныя акты заканадаўства (кодэксы, законы) прымаюцца толькі на рускай мове. Па-беларуску функцыянуюць найменш запатрабаваныя ў прававым звароце дакументы (напрыклад Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 г. № 384-З *Аб афіцыйных геральдычных сімвалах*).

Беларуская мова ў міжнародна-прававых актах

Першыя гады незалежнасці Беларусі былі таксама часам заключэння шэрагу міжнародных дамоў. Новай дзяржаве трэба было ўсталяваць дыпламатычныя адносіны, вырашыць пытанні ўзаемаадносінаў у сферы бяспекі, транспартных, падаткавых адносінаў, ажыццяўлення прававой дапамогі і г.д. Большасць міжнародных дамоў была заключана на рускай мове. Аднак, беларуская мова як аўтэнтычная мова міжнароднага акта была прадстаўлена пэўнай колькасцю дакументаў. Адным з найважнейшых пытанняў, якое трэба было вырашыць Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне – гэта ўсталяванне адносінаў паміж дзяржавамі, найперш суседнімі, і дзяржавамі, дзе стала пражывае значная колькасць беларусаў. Існавала патрэба ўзгадніць пытанні аказання прававой дапамогі, узаемадзеяння па атрыманню доказаў, выкананню судовых рашэнняў з іншай дзяржавы. У перыяд з 1990 г. па 1996 г. было падпісана некалькі такіх дамоў. Сярод іх Канвенцыя аб прававых адносінах, прававой дапамозе, па грамадзянскіх, сямейных, крымінальных справах, 1993 г. (Konvencìâ o pravovoj pomoŝi), двухбаковыя дамовы (Dagavor z Lìtoŭskaj Rèspublìkaj, Latvìjskaj Rèspublìkaj, Pol′ščaj і інш.). Значэнне гэтых пагадненняў было вельмі важным, паколькі яны дапамагалі вырашаць штодзённыя пытанні стасункаў паміж суб'ектамі розных дзяржаў. Толькі адзін з дагавораў аб прававой дапамозе быў першапачаткова складзены на беларускай мове. Гэта дагавор паміж Рэспублікай Беларусь

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

і Рэспублікай Польшча 1994 г. (Dagavor ab pravavoj dapamoze z Pol'ščaj), які прадаўжае выконваць свае функцыі па сённяшні дзень і мае права святкаваць у 2024 г. 30-ці гадовы юбілей.

Дагавор аб добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай, уступіў у сілу 15 снежня 1999 г., у артыкуле 11 прадугледжваецца права „обучаться на родном языке и родному языку" (Dagavor ab dobrasusedstve z Lìtvoj, арт. 11); у варунках двухмоўя гэта права вучыцца па-беларуску і па-руску. Тэкст згаданага дагавора складзены на рускай мове, але пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 25 красавіка 1996 г. № 216-XIII аб ратыфікацыі названага дагавору прынята на беларускай мове. Досыць складана зразумець логіку заканадаўцы, чаму выкарыстоўваецца такое спалучэнне. Аднак, калі ўзяць пад увагу тэндэнцыю выкарыстання беларускай мовы пры стварэнні „нязначных" актаў, з абмежаванай сферай ужывання (узнагароды, камандзіроўкі і г.д.), то з'ява ўпісваецца ў гэтую тэндэнцыю.

Нягледзячы на пераважную колькасць міжнародных пагадненняў на рускай мове, беларускамоўны сегмент тым не менш прысутнічаў, прычым у разнастайных сферах, нават у сферы абароны і бяспекі. Гэта спрыяе выпрацоўцы міжнародна-прававой тэрміналогіі і падкрэслівае здольнасць беларускай мовы выконваць функцыю мовы міждзяржаўных зносінаў. Згодна з артыкулам 28 Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь, Рэспублікай Казахстан, Кыргызскай Рэспублікай і Расійскай Федэрацыяй аб паглыбленні інтэграцыі ў эканамічнай і гуманітарнай галінах, дагавор складзены ў чатырох экзэмплярах на беларускай, казахскай, кыргызскай і рускай мовах, прычым усе тэксты маюць аднолькавую сілу (пастанова аб ратыфікацыі таксама па-беларуску) (Dagavor pamìž Rèspublìkaj Belarus′, Rèspublìkaj Kazahstan). Вельмі цяжка патлумачыць, чаму ў той самы перыяд міжнародныя пагадненні паміж тымі самымі дзяржавамі, хоць і па розных пытаннях у адным выпадку ствараліся на беларускай мове, а у іншых – на рускай.

Дагаворы аб прававой дапамозе прадугледжваюць палажэнні аб мове знешніх стасункаў. Згодна з артыкулам 4 Дагавора аб прававой дапамозе з Польшчай, кожны з бакоў ва ўзаемаадносінах паміж сабою карыстаецца сваёй дзяржаўнай мовай і прыкладвае пераклад на дзяржаўную мову другога боку ці на рускую мову альбо англійскую. Пры такім змесце нормы міжнароднай дамовы верагоднасць існавання алгарытма – дакумент складзены на беларускай мове, перакладзены на польскую, занадта нізкая.

У міжнародных пагадненнях агульнага тэрміналагічнага падыходу не назіраецца. У адным выпадку выкарыстоўваецца тэрмін *бакі*, у іншым *дагаворныя бакі* ці *дамаўляльныя бакі*. Абодва тэрміны – і *дагавор*, і *дамова* – існуюць і сустракаюцца ў літаратуры і дакументах. У сэнсе, які прасочваецца ў самім міжнародным пагадненні гаворка ідзе якраз пра бакі, якія дамаўляюцца аб чымсьці, што адлюстравана ў адпаведным дакуменце (дамаўляльныя як працэс).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Таму падаецца, што варыянт *дамаўляльных бакоў* больш адпавядае сэнсу, які закладваецца ў паняцце. У 1996 г. Рэспубліка Беларусь падпісала пэўную колькасць міжнародных пагадненняў аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання (напрыклад, Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Каралеўства Нідэрландаў аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў у дачыненні да падаткаў на даходы і маёмасць). У большасці дакументаў па гэтых пытаннях выкарыстоўваецца адзін і той жа тэрмін *Дагаворныя дзяржавы*.

Не менш важнае пытанне тэрміналогіі, якая выкарыстоўваецца для назвы саміх міжнародных пагадненняў. Канвенцыяй у праве міжнародных дагавораў называецца пагадненне, у якім удзельнічае некалькі дзяржаў. У той час, як пагадненне паміж дзвюма, але можа быць і некалькім дзяржавамі, звычайна выкарыстоўвае тэрмін *дагавор* (па-руску *договор* ці *соглашение*). Калі *соглашение* мы будзем перакладаць як *пагадненне*, і не мець вялікага сумневу, то выбар паміж *дамовай* ці *дагаворам* – даволі дыскусійнае пытанне. Можна заўважыць розніцу паміж сэнсам слоў *дамовіцца* ‘дасягнуць згоды’ і *дагаварыцца* ‘да нядобрага выніку, крайнасці’. Што з прапанаваных тэрмінаў больш па-беларуску? Ці ёсць фармальна юрыдычная розніца? У галінах унутранага права, грамадзянскім, сямейным, існуе сутнасная розніца паміж паняццямі *дагавор*/*дамова* і *пагадненне*, таму гэтыя тэрміны нельга разумець як сінанімічныя. Неафіцыйны пераклад Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвае тэрмін *дагавор* (арт. 390 ГК).

Беларуская юрыдычная тэрміналогія ў галінах унутранага заканадаўства

Да найбольш няўдалых цывілістычных тэрмінаў варта аднесці *здзелку* (па-руску *сделка*). Грамадзянскія кодэксы савецкіх рэспублік першапачаткова распрацоўваліся па-руску, дзе быў выкарыстаны тэрмін *сделка*, падобна да няўдалай калькі з рускай мовы (Gramadzânskì kodèks Belarusskaj SSR 1964 g.). У неафіцыйным перакладзе Грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь, які размешчаны на сайце Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, выкарыстаны таксама тэрмін *здзелка*. Яго ж падае анлайн слоўнік юрыдычных тэрмінаў на беларускай мове (Sloŭnìk ûrydyčnyh tèrmìnaŭ...). Што тычыцца прававых тэрмінаў, варта звярнуцца да аналізу іх паходжання. Значны ўнёсак у фарміраванне грамадзянскага права на рускай мове зрабілі расійскія дарэвалюцыйныя аўтары, якія, у сваю чаргу, абапіраліся на працы нямецкіх цывілістаў.

Гісторыя развіцця рускамоўнага тэрміна *сделка* моцна звязана з узнікненнем пандэктнай сістэмы грамадзянскага права. Тэрмін *сделка* (ням. *Rechtsgescheft*) узнік у XVIII ст. Георг Арнольд Хайзе ў першай кнізе сваёй працы *Общие учения*,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

выдадзенай у 1807 г., згадвае *дзеянні*. Нямецкае слова *rechtsgescheft* літаральна азначае ‘правовое дело/правая справа’. Яно прадстаўляе сабою спалучэнне двух слоў: *rechtliche* і *gescheft* (Čanturiâ, 2006).

Украіна ў сваім Нацыянальным грамадзянскім кодэксе, які быў прыняты ў 2003 г. *здзелку* называе *правочини*, арт. 11 (Civìl′nij kodeks Ukraïni, 2003). У Грамадзянскім кодэксе Польшчы тэрмін, аналагічны *здзелцы* – гэта *czynności prawne*, у літаральным перакладзе ‘юрыдычныя дзенянні’ (Kodeks cywilny, 1964). Прыведзеныя прыклады дазваляюць сцвярджаць, што польскі і ўкраінскі заканадаўца ў пошуку ўласнага тэрміна звяртаўся да аналізу паходжання прававой з’явы.

Ніякіх перашкод у айчыннага заканадаўцы пайсці тым самым шляхам падчас пошуку адэкватнага тэміна не існуе, тым больш што тут ёсць лагічнае абгрунтаванне. Альтэрнатывай *здзелцы* мог бы стаць тэрмін *юрыдычныя дзеянні*. *Здзелка* заўсёды з’яўляецца праявай волі, таму менавіта гэта важна падкрэсліць. Тэрмін *юрыдычныя дзеянні* пры перакладзе рускамоўнага арыгінальнага тэксту Грамадзянскага кодэкса на беларускую мову не заўсёды добра ўпісваецца ў калькавы пераклад, пад якім трэба разумець пераклад слова ў слова. Каб яго выкарыстаць, магчыма, узнікне патрэба змены пабудовы сказа. Для неафіцыйных перакладаў сапраўдных беларускіх кодэксаў адметны менавіта такі падыход. Перакладчык імкнецца захаваць і колькасць сказаў, і колькасць слоў у сказе, літаральна паўтараючы сінтаксічную будову сказа, пераказвае яе па-беларуску. Любое адступленне ад першапачатковай фармулёўкі, ужыванне іншай сінтаксічнай канструкцыі сказа пры перакладзе заўсёды звязана з рызыкай стварыць новы змест нормы права. Нельга сказаць, што гэтая праблема існуе толькі пры перакладзе з рускай на беларускую мову, яна характэрная ўвогуле для перакладаў і яе складана пераадолець.

Аб праблеме перакладу тэкстаў нарматыўных актаў згадваюць аўтары іншых краін СНД, напрыклад Казахстана, адзначаючы, што пры перакладзе адсутнасць адпаведнага тэрміна на нацыянальнай мове прыводзіць увогуле да скажэння зместу нормы. Яна набывае іншы сэнс (Ešniâzov, 2017, s. 112).

Мова, а дакладней тэрміналагічны апарат, менавіта грамадзянскага права з’яўляецца найбольш складаным, бо існуе вялікая колькасць спецыфічных прававых тэрмінаў (фідуцыярны, алеаторны, каўзальны і т д.).

Калі паспрабаваць перакласці сумнавядомы ў Беларусі Дэкрэт № 18 *О некотырых мерах защиты детей в неблагополучных семьях* (Dekret prezidenta Respubliki Belarus′..., 2006), неперадольную складанасць выклікае тэрмін *неблагополучный*. Пры дапамозе слоўнікаў *неблагополучный* перакладаецца як ‘нешчаслівы, няўдачны, нядобры, дрэнны, непаспяховы’ (Skarnìk, 2024). Анлайн слоўнік прававых тэрмінаў паняцце *неблагополучный* адносна сям’і не прапануе, але ёсць пераклад слова ў спалучэнні з іншымі, напрыклад, *благополучный регион* слоўнік прапануе *дабрабытны рэгіён*. У выпадку ж з *неблагополучным*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

регионом той самы слоўнік прапануе *недабрастотны рэгіён* (Sloŭnìk ûrydyčnyh tèrmìnaŭ, 2024). Само па сабе слова *благі* ў беларускай мове азначае ‘слабы, дрэнны’, а ў рускай мове мае супрацьлеглае значэнне, *благо* – гэта ‘дабро’. Адсутнасць у беларускай мове непасрэднага адпаведніка тэрміна *неблагополучный* увогуле не павінна з’яўляцца праблемай беларускай мовы. Гэта звыклая з’ява ў лінгвістыцы, калі пэўны тэрмін/слова з адной мовы не перакладаецца літаральна, а змест перадаецца пры дапамозе іншых словаспалучэнняў (напр. рус. *пожалуйста*, бел. *калі ласка*).

У сямейным праве тэрмін ‘бацькі’ адзін з падставовых, сямейнае права найперш рэгулюе адносіны паміж бацькамі і дзецьмі. Рускамоўны арыгінал Кодэкса аб шлюбе і сям’і выкарыстоўвае тэрмін *родители* ў множным ліку, і *родитель* у адзіночным. У беларускай мове *родитель* гэта бацька, а *родители* – бацькі. Атрымліваецца, што маці-*родитель* гэта таксама бацька. Ніякай памылкі тут няма, але шырокае разуменне сэнсу тэрміну *бацька*, які будзе выключна атаясамляцца з мужчынам, дазваляе сцвярджаць, што літаральны пераклад выкарыстоўваць неразумна, бо ён непазбежна прывядзе да блытаніны. Калі трэба выкарыстаць тэрмін у адзіночным ліку, варта ўжыць канструкцыю ‘адзін з бацькоў’. І гэта нішто іншае, як адметнасць беларускай мовы, што яшчэ раз падкрэслівае важнасць існавання працэсу нарматворчасці непасрэдна на глебе беларускай мовы.

Некаторыя прававыя тэрміны, нягледзячы на тое, што адносяцца да паўсюдна ўжываных, і на першы погляд не выклікаюць сумневу, даследчыкі ўсё ж адносяць да няўдалых. Такая з’ява як *страхаванне* добра вядомая кожнаму чалавеку і ў некаторых выпадках можа быць абавязковай. Тыповай прапановай на рынку паслуг па страхаванні з’яўляецца *поліс* на рускай мове. У перакладзе Грамадзянскага кодэкса ўжываецца аналаг рускага тэрміна *страхование – страхаванне*. У англійскай мове гэта *insurance*, ва укр. *страхування*. Вінцук Вячорка сцвярджае, што беларускае *страхаванне* – гэта русізм. Аўтар звяртаецца да аналізу аналагічнага паняцця ў мовах суседніх дзяржаў, дзе адно ўтварылася са значэнняў слова *страх* – ‘адказнасць’. Адсюль выраз *на свой страх и риск*, па-беларуску *пад сваю адказнасць*. Са спасылкай на слоўнік Івана Насовіча аўтар адзначае, што па-беларуску *страх*, гэта тое, што па руску *ужас*. Варыянт *убеспячэння*, які прапануе слоўнік Яна Станкевіча, Вінцук Вячорка таксама называе няўдалым з-за падабенства да польскага слова *ubezpieczenie*. У выніку сваіх разважанняў Вячорка прыходзіць да высновы, што лепшы адпаведнік не знайшоўся і згаджаецца з тым, каб пакінуць ужо звыклае *страхаванне*. (Vâčorka, 2017, s. 196).

Анатоль Сянько, звяртаючыся да тэмы публікацыі актаў заканадаўства на беларускай мове, таксама закранае праблему наяўнасці неабходнай юрыдычнай тэрміналогіі. Аўтар прыводзіць шэраг прыкладаў, калі рэсурсаў слоўнікаў, якія існуюць, недастаткова, каб перакласці спецыфічныя прававыя тэрміны *кража*, *хищение*, *грабеж*, *приговор*, *определение суда*. Пераклад з рускай на беларускую

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

мову і зноў на рускую аднаго і таго ж тэрміна дае непрадказальны вынік і прыводзіць да блытаніны. Аўтар вылучае тры кампаненты для паспяховага пераходу да публікацыі актаў заканадаўства адразу на абедзвюх мовах. Гэта і ёсць вырашэнне праблемы перакладу тэрмінаў з рускай мовы на беларускую. Па-другое, мэтазгодная падрыхтоўка беларуска-руска-беларускіх слоўнікаў юрыдычных тэрмінаў. Па-трэцяе, карысным было б стварэнне спецыяльнай платформы для афіцыйнай публікацыі на абедзвюх мовах з паралельнай працай над перакладам усіх актаў, якія да гэтага публікаваліся толькі на рускай мове (Sen′ko, 2012, s. 72–75).

Разважанні і прапановы слушныя, аднак Сянько не піша пра працэс нормatворчасці па-беларуску, а мае на ўвазе ўсё той жа пераклад. З абгрунтаваннем неабходнасці публікацыі актаў заканадаўства на абедзвюх дзяржаўных мовах у сітуацыі, пакуль захоўваецца білінгвізм, і патрэбай выпрацоўкі неабходнай юрыдычнай тэрміналогіі таксама можна поўнасцю пагадзіцца. Трэба, аднак, памятаць пра тое, што ў працэсе перакладу не варта абмяжоўвацца толькі ўласна перакладчыцкай працай, неабходна сур'ёзнае вывучэнне паходжання тэрміналогіі і добрае навуковае абгрунтаванне. Варта падкрэсліць, што працэс стварэння нормы права адразу па-беларуску здольны вырашыць праблему больш паспяхова, між іншым, знікне патрэба шукаць адпаведнікаў да слоў, і дазволіць не выкарыстоўваць сінтаксічных канструкцый сказаў, не характэрных для беларускай мовы.

Высновы

Можна абагульніць, што ад пачатку XX ст. да цяперашняга часу заканадаўства на беларускай мове прадстаўляла сабою пераважна пераклады.

У часы незалежнай Рэспублікі Беларусь працэс стварэння актаў заканадаўства на беларускай мове як юрыдычны абавязак дзяржавы быў даволі непрацяглым, што не дазволіла скласці добры падмурак для нормatворчасці па-беларуску. Гэта з'яўляецца вынікам агульнай палітыкі дзяржавы адносна мовы. Пераклады кодэксаў не маюць статуса афіцыяльных і не могуць быць выкарыстаныя ў правапрымяняльнай практыцы, на іх нельга спасылацца ў якасці абгрунтавання сваей пазіцыі у судовай сэчцы. Акрамя таго, існуе мноства „розначытанняў" і тэрміналагічнай неадпаведнасці (неафіцыйныя пераклады, слоўнікі), што стварае перашкоды ў выкарыстанні перакладзеных дакументаў на практыцы.

Пытанне распрацоўкі і навуковага абргунтавання сукупнасці прававой тэрміналогіі павінна разглядацца як самастойная мэта, без якой нормatворчасць па-беларуску не будзе эфектыўнай. У якасці аднаго з магчымых шляхоў вырашэння праблемы прапануецца ўлічваць этымалогію тэрміна пры перакладзе, а таксама інтэграваць перакладчыцкую дзейнасць з навуковымі даследаваннямі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

Неабходна абапірацца на аналіз і параўнанне прававых крыніц, ахопліваючы ўсе этапы гістарычнага развіцця Беларусі, напрыклад Статуты ВКЛ і іншыя дакументы таго часу, як каштоўныя тэрміналагічныя крыніцы. Сучасныя слоўнікі юрыдычнай тэрміналогіі, не валодаюць дастатковым патэнцыялам: яны пераважна агульнага характару і не адлюстроўваюць спецыфічных асаблівасцяў галіновага заканадаўства. Неабходная праца над стварэннем новых сучасных слоўнікаў прафесійнай юрыдычнай тэрміналогіі.

Ад пачатку XX ст. і да сённяшняга часу ў Беларусі не існавала і не існуе афіцыяльна прынятых кодэксаў на беларускай мове (акрамя аднаго). Беларуская мова рэдка выкарыстоўваецца ў правапрымяняльнай практыцы (натарыят, суды, справаводства і г.д.), юрыдычная адукацыя на беларускай мове ўвогуле не існуе – усё гэта адмоўна ўплывае на працэс выпрацоўкі юрыдычнай тэрміналогіі натуральным чынам.

Для развіцця спецыяльнай юрыдычнай тэрміналогіі прынцыпова ствараць акты заканадаўства адразу на беларускай мове, у перспектыве – толькі па-беларуску.

Навука і адукацыя можа развівацца ў эміграцыі і ствараць падмурак для далейшай працы над заканадаўствам па-беларуску ў краіне.

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Civìl'nij kodeks Ukraïni. (2003). (Vìdomostì Verhovnoï Radi Ukraïni (VVR), nr 40–44. [*Цивільний кодекс України*. (2003). (Відомості Верховної Ради України (ВВР), №№ 40–44], ст. 356). Pobrano z: https://zakon.rada.gov.ua/laws/show/435-15#Text (dostęp: 05.05.2024).

Dagavor pamìž Rèspublìkaj Belarus' ì Rèspublìkaj Pol'šča ab pravavoj dapamoze i pravavyh adnosinah pa gramadzânskih, sâmejnyh, pracoŭnyh i kryminal'nyh spravah, ustupìŭ u sìlu 30 lìpenâ 1995 goda. [*Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных, працоўных і крымінальных справах*, уступіў у сілу 30 ліпеня 1995 года].

Dekret Prezidenta Respubliki Belarus' ot 24.11.2006 g. № 18 „O dopolnitel'nyh merah po gosudarstvennoj zaŝitedetej v neblagopolučnyh sem'âh". [*Декрет Президента Республики Беларусь от 24.11.2006 г. № 18 „О дополнительных мерах по государственной защите детей в неблагополучных семьях"*].

Dogovor meždu Respublikoj Belarus', Respublikoj Kazahstan, Kyrgyzskoj Respublikoj i Rossijskoj Federaciej ob uglublenii integracii vèkonomičeskoj i gumanitarnoj oblastâh, vstupil v silu 9 iûlâ 1996 goda. [*Договор между Республикой Беларусь, Республикой Казахстан, Кыргызской Республикой и Российской Федерацией об углублении интеграции в экономической и гуманитарной областях*, вступил в силу 9 июля 1996 года].

Dogovor o dobrososedstve i sotrudničestve Meždurespublikoj Belarus' i Litovskoj Respublikoj, vstupil v silu 26 aprelâ 1996 goda. [*Договор о добрососедстве и сотрудничестве*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

между Республикой Беларусь и Литовской Республикой, вступил в силу 26 апреля 1996 года].

Ešniâzov, Nuržan. (2017). Model′ nedostatkov? Kollizionno-pravovyepoloženiâ Model′nogo Graždanskogo Kodeksa SNG i ih otraženie v nacional′nyh zakonodatel′stvah. *Kuķuķ žaňe memleket,* 3–4(76–77), s. 100–116 [Ешниязов, Нуржан. (2017). Модель недостатков? Коллизионно-правовые положения Модельного Гражданского Кодекса СНГ и их отражение в национальных законодательствах. *Құқық және мемлекет*, 3–4(76–77), с. 100–116].

Gramadzânskì kodèks Belarusskaj SSR (1964 g.). (1965). Mìnsk, Vydavectva „Belarus′". [*Грамадзянскі кодэкс Беларусскай ССР (1964 г.)*. (1965). Мінск, Выдавецтва „Беларусь"].

Kodeks cywilny, z dnia 23 kwietnia 1964 r. *Dziennik Ustaw*, nr 16, poz. 93.

Konstituciâ BSSR 1937 goda. [*Конституция БССР 1937 года*.]. Pobrano z: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/kanstytutsyi-belarusi/konstitutsiya-1937-goda/index.php#1937 (dostęp: 05.05.2024).

Konvenciâ o pravovoj pomoŝi, pravovyh otnošeniâh po graždanskim, semejnymi ugolovnym delam, zaklûčena v g. Minske 22.01.1993 goda. [*Конвенция о правовой помощи, правовых отношениях по гражданским, семейным и уголовным делам*, заключена в г. Минске 22.01.1993 года].

Čanturiâ, Lado (2006). Sdelka i voleiz″âvlenie v graždanskom prave. *Ûrist*, 3, 54–61. [Чантурия, Ладо (2006). Сделка и волеизъявление в гражданском праве. *Юрист*, 3, 54–61].

Krasnej, Vìktar. (1998). Funkcyânal′na-stylâvaâ dyferèncyâcyâ belaruskaj lìtaraturnaj movy. [Красней Віктар. (1998). Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы]. W: Aljaksandr Lukašanec, Mikalaj Prigodzič, Lidzija Sjameška (red.). *Belaruskaâ mova: Najnowsze dzieje języków słowiańskich* (s. 223–260). Opole: Uniwersytet Opolski.

Kuleš, Ganna. (2015). *Mova belaruskaga zakanadaŭstva XX stagoddzâ: genezìs ì èvalûcyâ*. Mìnsk: BDU. [Кулеш, Ганна. (2015). *Мова беларускага заканадаўства XX стагоддзя: генезіс і эвалюцыя.* Мінск: БДУ].

Kuleš, Ganna. (2016). Vykarystanne belaruskaj movy u zakanadaŭčajsfery va umovah bìlìngvìzmu. W: *Mova – Lìtaratura – Kul'tura: matèryâly VIII Mìžnar. navuk. kanf.,Mìnsk, 15–16 ver. 2016 g.* U 2 č., č. 1 (153–158). Belaruskì dzârž. un-t; u aŭtarskajrèdakcyì. Mìnsk: RÌVŠ. [Кулеш, Ганна. (2016). Выкарыстанне беларускай мовы у заканадаўчай сферы ва умовах білінгвізму. У: *Мова – Літаратура – Культура: матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 вер. 2016 г.* У 2 ч., ч. 1 (153–158). Беларускі дзярж. ун-т; у аўтарскай рэдакцыі. Мінск: РІВШ]

Martinovič, Izabella. (2008). Ukreplenie i razvitiekonstitucionnyh osnov (načal) sudebnoj vlasti – garantiâ èffektivnosti sudebnoj sistemy. *Ûsticiâ Belarusi*, 7, s. 12–16. [Мартинович, Изабелла. (2008). Укрепление и развитие конституционных основ (начал) судебной власти – гарантия эффективности судебной системы. *Юстиция Беларуси*, 7, с. 12–16].

Obzor narušenij âzykovyh prav v Belarusi s 1ânvarâ po 30 iûnâ 2023 goda. [*Обзор нарушений языковых прав в Беларуси с 1 января по 30 июня 2023 года*]. Pobrano z: https://penbelarus.org/2023/07/12/survey-of-violations-of-language-rights-in-belarus-from-january-1st-to-june-30th-2023.html (dostęp: 05.05.2024).

Pagadnenne pamìž Uradam Rèspublìkì Belarus' ì Uradam Karaleŭstva Nìdèrlandaŭ ab pazbâganni dvajnoga padatkaabkladannâ i papârèdžanni ŭhilennâ ad vyplaty padatkaŭ u dačynenni da padatkaŭ na dahody i maëmasc', uvajšoŭ u sìlu 31 snežnâ 1997 goda.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

[*Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Каралеўства Нідэрландаў аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў у дачыненні да падаткаў на даходы і маёмасць*, увайшоў у сілу 31 снежня 1997 года].

Russko-belarusskij onlajn slovar' Skarnik. [*Русско-беларусский онлайн словарь Скарник*. Pobrano z: https://www.skarnik.by/ (dostęp: 05.05.2024)].

Sâmeška, Lìdzìâ. (1998). Sacyâlìngvìstyčnyâ aspektyfunkcyâvannâ belaruskaj lìtaraturnaj movy. [Сямешка, Лідзія. (1998). Сацыялінгвістычныя аспекты функцыявання беларускай літаратурнай мовы]. W: Alâksandr Lukasanec, Mìkalaj Prigodzic, Lìdzìâ Sjameska (red.). *Belaruskaâ mova: Najnowsze dzieje języków słowiańskich* (24–54).

Sen′ko, Anatol′. (2012). Lingvističeskoe obespečen′e norm zakonodatel′stva o âzyke sudoproizvodstva. *Ûsticiâ Belarusi*, 3, s. 72–75. [Сенько, Анатолий. (2012). Лингвистическое обеспеченье норм законодательства о языке судопроизводства. *Юстиция Беларуси*, 3, с. 72–75].

Sloŭnìk ûrydyčnyh tèrmìnaŭ. [*Слоўнік юрыдычных тэрмінаў*]. Pobrano z: https://multilang.pravo.by/ru (dostęp: 05.05.2024).

Smol′skaâ, Taccâna; Hryščanovìč, Lûdmìla. (2016). *Belaruskaâ mova. Ûrydyčnaâ leksìka:vučèbny dapamožnìk dlâ studèntaŭ vyšèjšyh navučal'nyh ustanoŭ paûrydyčnyh specyâl'nascâh*. Mìnsk: Rèspublìkanskì ìnstytut vyšèjšaj školy. [Смольская, Таццяна; Хрышчановіч, Людміла. (2016). *Беларуская мова. Юрыдычная лексіка: вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па юрыдычных спецыяльнасцях*. Мінск: Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы].

Vâčorka, Vìncuk. (2017). *Ne smâšyce mae prynazoŭnìkì*. (Bìblìâtèka Svabody. XXI stagodz′dze). Radyë Svabodnaâ Èŭropa / Radyë Svaboda. [Вячорка, Вінцук. (2017). *Не смяшыце мае прыназоўнікі*. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе). Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода].

Vasilevič, Rygor. (2003). *Kommentarij k Zakonu „Onormativnyh pravovyh aktah Respubliki Belarus'"*. Minsk: Interpresservis. [Василевич Григорий. (2003). *Комментарий к Закону „О нормативных правовых актах Республики Беларусь"*. Минск. Интерпрессервис].

SUBMITTED: 2024.07.05
ACCEPTED: 2024.10.13
PUBLISHED ONLINE: 2025.01.08

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Alena Basalai (Алена Басалай) – Litwa; Vilnius; Europejski Uniwersytet Humanistyczny; mgr; *specjalność*: nauki prawne; *zainteresowania naukowe*: prawo cywilne, prawo rodzinne, prawo prywatne międzynarodowe.

Adres: 17 Savičiaus str., 01127 Vilnius, Lithuania

Wybrane publikacje:

1. Басалай, Елена. (2023). Защита прав и интересов ребенка при определении его находящимся в социально опасном положении. В: *Conferința științifică internațională*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/10/2026 05:19:28

„Interesul superior al copilului: abordare socio-culturală, normativă și jurisprudențială", vol. 2 (p. 101–112). Chişinău: Centrul Editorial-Poligrafic al USM. DOI: https://doi.org/10.5281/zenodo.76483872.

2. Басалай, Елена. (2020). Защита прав и законных интересов ребенка при смене пола родителями. В: Анатолій Гетьман (ред.). *Суперечності взаємодії моралі і права в сучасному суспільстві: Матеріали Міжнародної науково-практичної конференції, 22 травня 2020 р.* (с. 187–191). Харків: Друкарня Мадрид, НЮУ ім. Ярослава Мудрого.
3. Басалай, Елена. (2019). Установление происхождения детей в странах Балтии. В: Наталья Карпович (ред). *Право в современном белорусском обществе: сб. науч. трудов Нац. центр законодательства и правовых исследований Респ. Беларусь* (с. 314–321). Минск: Колорград.
4. Басалай, Елена. (2016). Основные подходы при установлении происхождения детей. В: Ольга Бакиновская (ред.). *Проблемы правового регулирования осуществления и защиты прав участников гражданских правоотношений: сб. науч. ст.* (с. 34–49). Минск: Бизнесофсет.
5. Басалай, Алена. (2012). Гаспадар і Рада Вялікага Княства Літоўскага ў судовай сістэме дзяржавы (канец XV – першая палова XIVст.). *Веснік БДУ. Серыя 3*, 3, с. 70–73.